# РЭДКІЯ ВЫДАННІ

Арыгінальнае, рэдкае выданне — заўсёды радасць для чытача. Такую радасць прыносіць, калі бярэш у рукі тоненькія брашуры У. І. Леніна, выдадзеныя друкарнямі Мінска, Гомеля, Смаленска і Магілёва ў першыя гады Савецкай улады. Яны цяпер беражліва захоўваюцца ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна ў аддзеле беларускай літаратуры і бібліяграфіі.

Першыя дзесяць ластавак прысвячаліся актуальным пытанням таго часу. У адну з брашур невялікага фармату «Як камуністы-бальшавікі адносяцца да сярэдняга сялянства» ўвайшоў даклад Леніна на VIII з'ездзе РКП(б). У прадмове А. Ханава «Чытай, селянін» гаворыцца: «Чытай, селянін, гэту кніжку, у якой запісана прамова правадыра рэвалюцыі таварыша Леніна, — ты даведаешся аб сапраўдных адносінах да цябе камуністаў і Савецкай улады. Чытай гэту кніжку, селянін, і памятай, што камуністы твае саюзнікі...»

За 50 гадоў у Беларусі выйшла каля 400 ленінскіх кніг, тыраж якіх перавышае чатыры мільёны экземпляраў.

Я. ЕТЧЫК.